Падтрымай "Вясну" на PATREON

Гродна: журналіст Андрэй Мялешка аштрафаваны на 40 базавых велічынь

02.12.2014 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода слова



Андрэй Мялешка

2 снежня да чарговага штрафу паводле артыкулу 22.9, частка 2 Адміністрацыйнага кодэксу (незаконны выраб і распаўсюд інфармацыйнай прадукцыі) быў асуджаны гродзенскі журналіст-фрылансер Андрэй Мялешка. Паводле пастановы суддзі Ленінскага раённага суда Юрыя Казакевіча ён аштрафаваны на 40 базавых велічынь, што складае 6 мільёнаў беларускіх рублёў.

16 кастрычніка бягучага года Андрэй Мялешка ў абласной бібліятэцы імя Карскага на прэзентацыі гістарычных выданняў запісаў кароткі каментар аднаго з аўтараў кніжкі – прафесара Гарадзенскага ўніверсітэту імя Янкі Купалы Валерыя Чарапіцы. Пазней аўдыёфрагмент быў змешчаны на сайце Беларускага Радыё Рацыя. Ленінскі РАУС пачаў па гэтым факце ў дачыненні Мялешкі адміністрацыйную справу.

На судовым працэсе першым сведкам выступаў загадчык кафедры славянскіх дзяржаваў Валерый Чарапіца, які пацвердзіў факт таго, што даваў каментар Мялешку. Іншая ж сведка – Тамара Піваврчык зусім заблыталася ў сваіх паказаннях. Так, у пратаколе апытання, складзеным міліцыяй, яна сцвярджала, што дакладна бачыла, як Мялешка браў інтэрв'ю ў Чарапіцы. На працэсе ж сцвярджала зусім адваротнае, а на пытанні суддзі не магла выразна сфармуляваць свае адказы. Пікантнасць сітуацыі ў тым, што Піваварчык Тамара Анатолеўна ўзначальвае кафедру журналістыкі Гродзенскага ўніверсітэту.

У выніку разгляду справы, якая доўжылася менш за паўтары гадзіны з перапынкам, суддзя Юрый Казакевіч, нягледзячы на адсутнасць доказаў віны Андрэя Мялешкі і неадпаведнасць адміністрацыйнага артыкулу сутнасці сітуацыі, прызнаў журналіста вінаватым і пакараў яго вялікім штрафам. Раней, 4 красавіка бягучага года, гэты ж суддзя асудзіў па тым жа артыкуле на 30 базавых штрафу іншага гродзенскага журналіста-фрылансера – Алеся Дзянісава.

Нагадаем, што гэта ўжо трэці аналагічны штраф Андрэю Мялешку за журналісцкую дзейнасць. 16 чэрвеня ў судзе Кастрычніцкага раёну Гродна намеснік старшыні гэтага суда Дзмітрый Кедаль пакараў фрылансера штрафам на 30 базавых велічынь, а 7 кастрычніка ў Гродзенскім раённым судзе суддзя Ганна Лявусік вынесла журналісту пакаранне ў выглядзе штрафу памерам 35 базавых велічыняў.

Пераслед незалежных журналістаў на Гродзеншчыне працягваецца. Чарговую справу пачаў Слонімскі РАУС у дачыненні да журналіста Алеся Залеўскага.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ


Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY